Найлепшая каманда – СЯМ’Я!

Аўтар: Бр. Тадэвуш, с. Эстэра, ларэтанка
23.08.2015 01:00



Усе птушкі і жывёлы ведаюць, што важней за ўсё цэлая і бяспечная сям’я. Кожны ў гэтай сям’і мае сваё месца і заданне. Менавіта так усё гэта было цудоўна запланавана і створана Панам Богам, каб без збояў добра дзейнічала. Людзі адрозніваюцца ад жывёл і птушак тым, што маюць розум і волю, а не толькі інстынкт. Таму, ужываючы розум і сэрца, мы ведаем, што сям’я проста незамянімая.

ТРЭБА АЗДОБІЦЬ ПА-МАЙСКУ МАЦІ КАРАЛЕВУ НАШУ.

ГЛЕДЗЯЧЫ НА ПТУШЫНУЮ СЯМ’Ю, ДЗЯКУЕМ БОГУ ЗА СВАЮ.

ДЗЯЎЧЫНКІ ЛЮБЯЦЬ ШЧЫРА, КАЛІ ХЛОПЦЫ, ЯК РЫЦАРЫ.

У КАЗКАХ ЖЫЛІ ШЧАСЛІВА, БО МАЛІЛІСЯ ЦЯРПЛІВА. †

Як добра, што ў нас ёсць мама і тата! Можна вучыцца ў іх дабрыні і любові, але трэба таксама не забывацца заўсёды з удзячнасцю маліцца за іх і ніколі іх не крыўдзіць. У кожнай культуры і ў кожную эпоху найбольшай пашанай былі акружаны бацькі. Гэта ніколі не можа змяніцца. Таму трэба памятаць, што мы павінны любіць і шанаваць тых, дзякуючы каму мы жывём. Наш клопат пра іх павінен ісці за імі праз усё жыццё, а пасля іх смерці – нястомная памяць у малітве.